ISSN 0130—[illegible]

# Полымя

# 5

У НУМАРЫ:

**ВАСІЛЬ ЗУЁНАК**
**ЮРКА ГОЛУБ**
Новыя вершы

**МІКОЛА ЗАХАРАНКА**
Апавяданне

**Чалавецтва ўратуецца падзвігам духу**
*Гутарка Алеся Адамовіча з Васілём Быкавым*

**2001**

# Полымя

5

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ
ЧАСОПІС

(865)

ВЫДАЕЦЦА СА СНЕЖНЯ 1922 ГОДА

2001

м а й



Аддзел бягучых перыядычных выданняў

г. Брест,
бульвар Космонавтов, 48
Областная библиотека
им. М. Горького


## ЗМЕСТ


3 ВАСІЛЬ ЗУЁНАК. Роднае. ***Кастрычнік... Памяць. Снягі прачыстыя... Нараджэнне. ***Вітаю Ізраіль... ***Прыходзіць ноч, сказаў Ісус Хрыстос... "Галаслівая Прыпяць...". Спытайце яблыню... ***Белае надрэчча... Чаканне. Знікненне. Сонейка. ***Мізарнее запас... ***Хто небяспечней: злодзей ці прарок?.. Ветрана. ***Сцвярджае нам за векам век... Снежань: з першага на другое... ***Сёння з енкам сабакі грызуцца... ***Сказаў аднойчы чалавек... ***І нікуды ад шчасця свайго не ўцячэш... Гімн. ***Міленіум, мяжа тысячагоддзяў... ***Снежных вятроў галасы... Снегіры. Вершы.

18 МІКОЛА ЗАХАРАНКА. Насланнё. Апавяданне.

48 ЮРКА ГОЛУБ. З кнігі "Поруч з дажджом". Вершы.

57 АНАТОЛЬ БУТЭВІЧ. І збаў нас ад спакусы. Эсэ.

74 ГАЛІНА ВАРАТЫНСКАЯ. ***Нічым не абавязаны... ***Я вас люблю. І кожнага, і усіх... Вершы.

76 ЗІНАІДА ДУДЗЮК. Архірэевы скарбы. Раздзелы з рамана.

148 ЧАЛАВЕЦТВА УРАТУЕЦЦА ПОДЗВІГАМ ДУХУ. Гутарка Алеся Адамовіча з народным пісьменнікам Беларусі Васілём

Быкавым. Уступнае слова і публікацыя В.С.Адамовіч. Апрацоўка і падрыхтоўка да друку А. Урбана.
194 ВАЛЯНЦІН ТАРАС. Сцяпанавы яблыкі.
211 ВАСІЛЬ МАКАРЭВІЧ. Жаўранкава мелодыя. Эсэ.
222 ПЯТРО ПРЫХОДЗЬКА. Водгаласы юнацтва. Падзенне Берлінскай сцяны
230 ЭМАНУІЛ ЮФЕ. Гарадок над Бярозай-ракой.
246 ВАЛЯНЦІНА ЛОКУН. Узняцца да лёсу агульначалавечага.
263 ГАЛІНА ДАШКЕВІЧ. Жанчына і вайна.
272 ДЗМІТРЫЙ БУГАЁЎ. Яны абодва непаўторныя ва ўсім.
277 ЕВА ЛЯВОНАВА. Яшчэ трымаюцца літары, а прысвячэнне сцёртае...

Галоўны рэдактар
Сяргей ЗАКОННІКАЎ.
Рэдакцыйная калегія:
Рыгор БАРАДУЛІН,
Янка БРЫЛЬ,
Дзмітрый БУГАЁЎ,
Ніл ГІЛЕВІЧ,
Генадзь ДЗМІТРЫЕЎ (намеснік галоўнага рэдактара),
Аляксей ДУДАРАЎ,
Алесь ЖУК,
Віктар КАВАЛЕНКА,
Анатоль КЛЫШКА,
Валянціна КОЎТУН,
Іван НАВУМЕНКА,
Алесь ПІСЬМЯНКОЎ,
Іван ПТАШНІКАЎ,
Барыс ПЯТРОВІЧ (САЧАНКА)
(намеснік галоўнага рэдактара—адказны сакратар),
Кастусь ЦВІРКА,
Іван ШАМЯКІН.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Саюз беларускіх пісьменнікаў, калектыў часопіса "Полымя".

Рэдакцыя часопіса "Полымя", 220005, Мінск, Захарава, 19.
Наш рахунак: 3012202840014 у Славянскім аддзяленні Белбізнесбанка, код 834.
Тэлефоны: галоўнага рэдактара — 284-80-12;
намеснікаў галоўнага рэдактара,аддзелаў літаратуры,
грамадскага жыцця і культуры — 284-49-91, бухгалтэрыі — 284-80-91.

© "Полымя", 2001

ВАЛЯНЦІНА ЛОКУН

# УЗНЯЦЦА ДА ЛЁСУ АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА

У сваей знакамітай працы "Сэнс гісторыі" Бярдзяеу сцвярджае, што "на падмурку філасофіі і гісторыі ствараецца нацыянальная свядомасць". Сувязь паміж гісторыяй як рэальным фактам і філасофскім яе асэнсаваннем заусёды вызначалася складанасцю і шматмернасцю. Аднак, як увогуле разумець гэтае паняцце — гісторыя? М.Фёдараў найперш адрозніваў гісторыю **як факт**, што азначала "ўзаемнае знішчэнне, знішчэнне адзін аднаго і саміх сябе, рабаванне або раскраданне праз эксплуатацыю і ўтылізацыю ўсёй знешняй прыроды (г.зн. зямлі)... уласнае выраджэнне і паміранне (г.зн. культуры)". Філосаф лічыў, што сапраўдная гісторыя — гэта акт духоўны, гэта "праект, які мае на мэце аб'яднанне жывых дзеля уваскрэсення памерлых", бо менавіта "сапраўднае... уваскрэсенне ужо ёсць поуная, усебаковая гісторыя"(Федоров Н.Ф. Сочинения. М., 1982). "Гісторыя не ёсць аб'ектыўная эмпірычная дадзенасць, гісторыя ёсць міф", — быу пераканаы М.Бярдзяеў. І міф не прыдуманы, а рэальны, бо "міф ёсць у народнай памяці захаваны аповед пра тое, што адбылося у мінулым, аповед, які пераадолеу межы знешняй аб'ектыўнай фактычнасці і раскрыу фактычнасць ідэальную, суб'ект-аб'ектную". Усё ж такі аб'ектыўную, хоць і праз індывідуальнае свядомаснае адлюстраванне. Такія міфы існавалі у эпоху Рэнесансу і Рэфармацыі, сярэднявечча і ранейшай гісторыі чалавецтва. З міфа пачынаецца гісторыя чалавецтва, міфам яна і заканчваецца.

Свой міф мае кожная вялікая эпоха чалавецтва, мае яго эпоха сучасная. Кіруючыся логікай філосафа, свой міф мае і кожная вялікая вайна, бо гэта заўсёды гістарычная “эпоха” ў развіцці чалавецтва. А філасофія гісторыі, філасофія вайны ў дачыненні да літаратуры — гэта **свядомаснае** яе адлюстраванне пісьменнікам, адлюстраванне “суб’ект-аб’ектнае”.

Л.Талстой адзін з першых сярод пісьменнікаў ваеннай прозы імкнуўся адлюстраваць вайну “суб’ект-аб’ектна”. Але насуперак бярдзяеўскаму “мы не можам зразумець выключна аб’ектнай гісторыі” Л.Талстой хацеў зразумець вайну і як факт гісторыі, і як з’яву духоўную. Апошняе дамінуе. Аб’ектны змест гісторыі, па Л.Талстому, ёсць рэальнае жыццё, рэальны факт, рэальная гістарычная падзея. Адлюстраванне аб’ектнай гісторыі ўключае ў сябе неабходнасць дакумента. Л.Талстой смела ўводзіў у кампазіцыйную структуру рамана “Вайна і мір” апісанне ваенных падзей і асобных фактаў 1805—1820 гадоў, шырока выкарыстоўваў гістарычны дакумент як аснову вобраза гісторыі. Пазней гэта стане дамінантнай традыцыяй у адлюстраванні вобраза вайны.

Цалкам на дакументалізме, на ўласна перажытым пабудавана аповесць М.Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне”. Твор нават суправаджаецца аўтарскім тлумачэннем: “Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы”. Лявон Задума — гэта сам пісьменнік, які пайшоў у армію вольнапісаным. Факт, рэальная падзея, дакладная фраза, суб’ектыўнае ўражанне — усё папярэдне запісанае М.Гарэцкім пасля стане фактам і “ўражаннем” эстэтычным. Дакументалізм М.Гарэцкага, які А.Адамовіч назваў трагічным, вынікаў з вопыту трагічнага жыцця самога пісьменніка. М.Гарэцкі як заснавальнік нацыянальнай рэалістычнай школы стварыў сваю канцэпцыю вайны. Але яго вайна, як і вайна Л.Талстога, таксама “суб’ект-аб’ектная”. Дакументалізм савецкай літаратуры 60-х гадоў, асабліва той яе часткі, якая прысвечана другой сусветнай вайне, гэта працяг традыцый “Вайны і міру” на новым этапе развіцця. В.Быкаў, Я.Брыль, І.Навуменка, І.Шамякін, А.Адамовіч, Р.Бакланаў, Ю.Бондараў, В.Кандрацьеў, А.Ганчар, Ю.Збанацкі, Л.Первамайскі, М.Стэльмах, П.Заграбельны і іншыя былі непасрэднымі ўдзельнікамі вайны. Але іх проза становіцца ўжо больш свабоднай у адносінах да рэальнага факта. Гэтых пісьменнікаў цікавіла найперш сфера псіхалагічнай дакладнасці, хоць і падзейная таксама.

Ваенная проза першай паловы XX стагоддзя ўскладняецца матывам “суб’ектыўнай” віны, віны сацыяльнай. Пра гэта сведчыла

проза М.Гарэцкага з досыць моцным сацыяльным пачаткам, матывам "горкай праўды", якая спараджалася "суб'ектыўнай" віной — віной дзяржавы. Матыў віны дзяржавы дамінаваў у еўрапейскай прозе першай сусветнай вайны (А.Барбюс "Агонь"). І асабліва ў літаратуры "згубленага пакалення": Э.Рэмарк "На заходнім фронце без змен", Э.Хэмінгуэй "Бывай, зброя", Р.Олдзінгтон "Смерць героя", Д.Пасос "ЗША". У савецкай літаратуры 50—60-х гадоў гэты матыў чытаўся ў падтэксце і толькі часам вырываўся на паверхню: "Мёртвым не баліць" В.Быкава, "Жыццё і лёс" В.Гросмана.

У вайне 1812 года салдаты і афіцэры, увесь рускі народ былі паяднаны адзіным вялікім патрыятычным пачуццём, святым для рускага чалавека. Гэта быў яшчэ час, калі, кажучы словамі філосафа Салаўёва, "усякі ваенны чалавек — салдат ці фельдмаршал, усё роўна — ведаў і адчуваў, што ён служыць справе важнай і добрай — не карыснай толькі ці патрэбнай... а ў вышэйшым сэнсе добрай, высакароднай, пачэснай справе, якой заўсёды служылі самыя лепшыя, першыя людзі, правадыры народаў, героі" (Соловьев В. Три разговора. М., 1991). Гэта — канцэпцыя вайны 1812 года Л.Талстога. Адсюль і рамантызм пісьменніка побач з падкрэсленым рэалізмам. Князь Балконскі прыбывае на пазіцыю батарэі Тушына: "Першае, што ён убачыў, выязджаючы на тую прастору, што займалі гарматы Тушына, быў выпражаны конь з перабітай нагой, ён іржаў каля запрэжаных коней. З нагі яго, як з крыніцы, лілася кроў. Паміж перадкамі ляжала некалькі забітых"[1]. Малюнак дэталізаваны, аголена праўдзівы. Гэта вобраз ваеннай трагедыі, узор рэалістычна бязлітаснага адлюстравання вайны як драмы. Разам з гэтым атмасфера бою ў Л.Талстога азартна ажыўленая, калі можна так сказаць. Менавіта тая парадная, якая прачытвалася некалі ў класіцыстаў і рамантыкаў. Праўда, параднасць гэтая не ў аўтарскім слове ці аўтарскім падыходзе, яна ў рамантызавана-ўрачыстым успрыманні падзеі самімі яе ўдзельнікамі, у тым пад'ёме патрыятычнага пачуцця, якое авалодвала героямі. Вайна для Тушына не толькі кроў і смерць, ад чаго ён толькі "моршчыўся" і "злосна крычаў на людзей", але і нешта яшчэ незвычайнае, рамантычна-ўзнёслае, гэта яшчэ і нейкая асаблівая сімфонія гукаў, якая выклікала ў яго ўнутранае задавальненне. І гэта ідзе яшчэ ад Стэндаля, а пасля і Лермантава. Так, "не помнячы сябе ад захаплення і шчасця", успрымаў гукі вайны Фабрыцыо, герой Стэндаля.

[1] Т о л с т о й Л. Н. Собр. соч. в 22-х томах. Т.4. М.,1973. С. 244. Далей спасылкі на гэтае выданне даюцца ў тэксце, першая лічба — том, другая — старонка.

Пазней у савецкай літаратуры з'явіцца цэлая плынь рамантызаванай прозы аб вайне, якая найбольш выяўнай будзе ва украінскай літаратуры — А.Даужэнка, М.Стэльмах, А.Ганчар. Апошняга, дарэчы, Г.Ламідзе назваў "адным з найталенавітых прадстаўнікоў рамантычнай плыні ў савецкай літаратуры". Герой рамана "Сцяганосцы" лейтэнант Чарныш успрымае свой першы бой так, "нібыта усё неба адразу ператварылася ў грандыёзны блакітны арган і зайграла..." (Гончар О. Знаменосцы. М., 1980).

Руская класічная літаратура XIX стагоддзя была прасякнута вераю ў свой народ, спадзяваннем на яго высокі дух. Ф.Дастаеўскі пісаў, што у А.Пушкіна "паўсюль... чуецца вера ў рускі характар, вера ў яго духоўную моц, а калі ёсць вера, дык ёсць і надзея, вялікая надзея на рускага чалавека". Такі падыход імпанаваў і аўтару "Вайны і міру". Тады яшчэ была, існавала вера ў непераможны дух народа.

М.Гарэцкі у сваёй творчасці кіраваўся нацыянальнай ідэяй, філасофскімі пошукамі свайго часу. Ён выступаў як аўтар з тонкім разуменнем асаблівасцяў гістарычнага шляху свайго народа і асаблівасцяў нацыянальнай свядомасці. Ідэя незалежнасці як беларуская ідэя на пачатку XX стагоддзя дамінавала у эстэтычнай свядомасці аўтара "На імперыялістычнай вайне". Як адзначыў В.Каваленка, М.Гарэцкі "шукаў і знаходзіў занядбаныя феномены нацыянальнага духоўнага жыцця". І песімізм аўтара не столькі ад трагедыі жыцця, трагедыі вайны, ад яе непатрэбнасці і злачыннасці, але яшчэ і ад немагчымасці вырашыць нацыянальнае пытанне. Беларускі аўтар пераняў талстоўскі пафас адмаўлення вайны як дзеяння непрымальнага для чалавечага розуму, усёй чалавечай прыроды. Але пры гэтым ён яшчэ больш засяродзіўся на адлюстраванні вайны як драмы. Яго вайна наскрозь трагічная. Праявы гераізму таксама існуюць, але яны не з'яўляюцца масавымі і заканамернымі, як гэта было у Л.Талстога. Яны — эпізадычныя. І вынікаюць не з сацыяльнай прыроды чалавека (гэтак будзе пазней у савецкай літаратуры), а з яго суб'ектыўна-маральных якасцяў. Вайна антынародная не толькі па сваёй сутнасці (льецца кроў, смерць паўсюдная), але па сваёй палітычнай, ідэалагічнай накіраванасці. Беларус Лявон Задума не ведае, чые інтарэсы — расійскія? імперскія? — яму трэба бараніць. Таму і бачыць адно толькі "стагнанні, кроў..." Аўтара цікавяць не столькі баталіі вайны, колькі рэакцыя салдата на гэтыя баталіі.

Вайна пакінула героя М.Гарэцкага жывым, але знявечыла душу. Яна "забіла" яго ўнутрана. Як забівала герояў літаратуры "згубленага пакалення" — аб чым сведчаць творы Э.Рэмарка, Р.Олдзінгтона,

Д.Пасоса, Э.Хэмінгуэя. Задоўга да "Чужога" А.Камю М.Гарэцкі з уразлівай сілай паказаў адчужэнне чалавека ад свету, калі ў аснову гэтага свету не пакладзены гуманізм духу, маральныя каштоўнасці, выпрацаваныя чалавецтвам на працягу свайго існавання. Як слушна заўважыў Л.Гаранін, "М.Гарэцкі, як ніхто іншы з беларускіх пісьменнікаў да яго, адчуў з надыходам XX стагоддзя пачатак загнівання ранейшага светапарадку, ранейшага светаўяўлення, надыход эпохі трагічных калізій і хваляванняў. Пры гэтым ён першы выказаў думку, што асаблівую небяспеку гэты новы стан жыцця мае для сучаснага і будучага беларускага народа" (Гаранін Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Мн., 1996).

Канцэпцыя вайны М.Гарэцкага таксама ўключае ў сябе пытанне аб духоўных патэнцыях беларускага народа. Гэты народ мае свайго годнага героя, героя-інтэлігента, героя рэфлексуючага, героя з вялікімі духоўнымі запатрабаваннямі. Такі народ мае права на самастойнае існаванне і сам павінен вызначаць свой лёс. Пісьменнік М.Гарэцкі адлюстраваў, у параўнанні з Ф.Багушэвічам, Я.Лучынам, Я.Купалам, Я.Коласам, М.Багдановічам, якасна новую ступень развіцця нацыянальнай свядомасці, абуджэнне яе ўнутраных нявыкарыстаных магчымасцяў.

Руская рэлігійная філасофская думка канца XIX — пачатку XX стагоддзя была звязана з апакаліпсічным матывам. Крызіс гуманізму, песімістычныя матывы прапаведавала і еўрапейская філасофія і, як яе адбітак, літаратура "згубленага пакалення", а пазней і экзістэнцыяльная літаратура. Адгалоскі гэтага светаўспрымання не маглі не закрануць і славянскія літаратуры на пачатку XX стагоддзя. У прыватнасці, прозу М.Гарэцкага. Песімізм яго герояў яшчэ і адтуль.

М.Бярдзяеў пісаў, што філасофію гісторыі можна спасцігнуць толькі праз спасціжэнне гістарычнага лёсу чалавека: "Тэмай гісторыі... з'яўляецца лёс чалавека ў зямным чалавечым жыцці, і гэты лёс чалавека, які ажыццяўляецца ў гісторыі народаў, спасцігаецца перш за ўсё як лёс чалавека ў духу пазнаючага". Іншымі словамі, суб'ектыўна. Але ёсць у гэтым спасціжэнні і аб'ектыўны момант. Бо чалавек, акрамя ўсяго іншага, ёсць у найвысокай ступені яшчэ і гістарычная істота, якая ўпітвае ў сябе ўсё тое, што было назапашана папярэднімі эпохамі. Чалавек з гістарычным часам знаходзіцца ў складанай узаемасувязі. Яны — узаемазалежныя. Адсюль, з гэтай залежнасці, і тоеснасць паміж індывідуальным гістарычным лёсам і лёсам свайго народа, апошні сваімі больш агульнымі рысамі ўліваецца ў лёс усяго чалавецтва.

Такім чынам, праз лёс індывідуальнага і канкрэтнага "я" можна ўзняцца да лёсу агульначалавечага. "Кожны чалавек па сваёй унутранай прыродзе ёсць нейкі вялікі свет — мікракосм, у якім адлюстроўваецца і знаходзіцца ўвесь рэальны свет і ўсе гістарычныя эпохі..." У гэтым, па сутнасці, і заключаецца дыялектыка чалавека і гісторыі, узаемасувязь індывідуальнага і больш агульнага. Усё гэта абумовіла шырокі дыяпазон пошукаў у вызначэнні тыпаў нацыянальнага характару. Я.Колас адкрыў тып Міхала — селяніна, спрадвечнага шукальніка шчасця на зямлі. А.Пушкін адкрыў тып Таццяны, па словах Ф.Дастаеўскага, — "жанчыны дасканала рускай, якая засцерагла сябе ад наноснай хлусні". Сам Ф.Дастаеўскі стварыў тып людзей падполля. Л.Талстой у "Вайне і міры" адкрыў свету галерэю вобразаў-тыпаў, якія прадстаўлялі розныя слаі расійскага грамадства на пачатку XIX стагоддзя і якія ў сукупнасці складалі нацыянальную супольнасць пад назвай рускі народ.

Адметны нацыянальны тып стварыў і беларускі пісьменнік Кузьма Чорны. Як і Л.Талстой, ён успрымаў народнае жыццё як адзіны духоўны арганізм. "Голас народа" запаўняе літаральна ўсю раманную прастору. Пры гэтым "народныя вобразы" К.Чорнага з'яўляюцца не спарадычна, не на "другіх" ролях. Кажучы словамі М.Тычыны, яны — "аб'ект увагі і любові, за якой столькі асабістага, шчымліва-інтымнага". Пасля М.Гарэцкага зноў на ўвесь голас загаварыў вечны гарапашнік, "пан сахі і касы", загаварыў народ, які яшчэ дагэтуль загаварыць не мог, бо быў пад уціскам, не меў свайго нацыянальнага голасу. Гэта не вобраз натоўпу або масы, як гэта было, напрыклад, у Ф.Дастаеўскага. Маса не мае памяці. У К.Чорнага кожны "голас" — асобны, своеасаблівы. Па глыбіні адлюстравання гэта "голас" - тып.

Уводзіцца паняцце дома, сям'і як формы роевага існавання. Чалавек знаходзіць сябе ў прыродным асяроддзі, у сіле свайго духоўнага адзінства з усімі людзьмі свету, а перадусім з сям'ёй, домам. К.Чорны спрабуе сумясціць агульнагуманістычную і хрысціянскую свядомасць. Ён услед за М.Гарэцкім, услед за Л.Талстым імкнецца вярнуць свету чалавека духоўнага.

У аўтара "Вайны і міру" менавіта боская воля, дзейнічаючы нябачным чынам у незлічоных праявах народнага жыцця, штурхае народ на змаганне. Катэгорыя патрыятычнага ў К.Чорнага змястоўна іншая. Тут на першае месца вылучаюцца "сфера" уласна перажытага, а таксама "сфера" нацыянальнага "я" беларуса.

Чорнаускі герой, прайшоўшы праз трагедыю вайны, жыць далей не мае сіл. Абаронца Брэсцкай крэпасці Мішурын пасля доўгіх бадзянняў па лесе, сустрэўся з Антонам Цвіркам, апошні страціў на вайне ўсё, чым жыў. Паміж імі адбыўся характэрны дыялог:

"— Куды ты ідзеш, чалавеча? — запытаў Мішурын. (Чалавек маўчаў.) Адкуль жа ты?

— Па той бок Баранавіч. Сцяпуркі. Не чулі? Сцяпуркі лічацца як бы мястэчкам.

— А куды ты ідзеш? (Ён зноў маўчаў.) Як ты завешся?

— Антон Цвірка.

— Што ты робіш тут?

— Я ўжо тут два дні. Раней я ішоў там. А цяпер — выйду за лес і назад вярнуся. Некалькі разоў.

— А куды табе трэба ісці?

— Мне нікуды не трэба ісці. У мяне быў дом.

— Дома няма цяпер?

— Няма. І нічога больш няма.

Ніжняя палова яго твару ўздрыганулася і ён зрабіў крок да Мішурына.

— А сям'я твая дзе? Ці сям'і не было ў цябе?

— Уся мая сям'я ляжыць на дарозе. Жонка звісла тварам у канаву, а хлопчык ляжаў грудзьмі на бакавым камені.

— Што ты цяпер рабіць думаеш?

— Нічога. На свеце ўжо няма мне больш чаго рабіць. Што ж рабіць? Каб і хацеў, дык няма за што рук заняць.

— Але ж ты жывы астаўся.

— Які ж я жывы? Жывы павінен жыць. А нашто мне жыць? Хіба каб сышоў куды ў далёкі свет, можа б, там забыўся, што жыў некалі ў гэтым месцы"(Чорны К. Збор твораў у 8-мі тамах. Т.6. Мн., 1974. С.375-376.).

Паняцце дома і жыцця атаясамляецца ў К.Чорнага з паняццем быцця. З паняццем касмічнай прасторы. Становіцца філасофскай катэгорыяй. Дом гэта яшчэ і сувязь — часавая і прасторавая. І вось гэтая пераемная сувязь перарвалася. Будучыня, такім чынам, зыходзіць у нябыт. Рушыцца і жыццё прыроднае, бесперапыннае ў сваёй хадзе.

К.Чорны насуперак нарматывізму літаратуры 40-х гадоў, усё ж здолеў выказаць бачанне лёсу беларуса. Трагічнага лёсу. І трагедыю нацыі, якой не даюць магчымасці збудаваць свой нацыянальны "дом".

Адбылася непапраўная катастрофа ў лёсе чалавека, катастрофа ў яго нацыянальным самаадчуванні, катастрофа адыходу ад спрадвечна сялянскага, спрадвечна народнага. Вайна як катастрофа сацыяльнага плана паглыбіла трагедыю народа. Трагедыю бясконцую ў гістарычным часе, бо катастрофы апаноўваюць беларускага селяніна няўхільна і рэгулярна, з нейкай зламыснай заканамернасцю, фатальнай накапаванасцю. Страта дома, смерць блізкіх, бадзянне па свеце, пакуты дзяцей і дарослых. І гэтак — ад пакалення да пакалення. Гісторыя ідзе па замкнёнай прасторы, бясконцая і статычная, яна — нібыта бег на месцы, усё вяртаецца на кругі свае, усё пачынаецца спачатку. Без надзеі вырвацца за гэтую трагічную прастору.

Важна і тое, што К.Чорны, узіраючыся ў масу людзей, у натоўп, бачыць твар кожнага асобнага чалавека, чытае яго думку, нават яе нараджэнне: "Гадзіны ішлі за гадзінамі, і вось на дарозе відзён стаў вялікі натоўп. Белыя і чырвоныя хусткі на галовах, клункі за плячыма, дзеці на руках і побач сваіх матак. Пакуль што яны ішлі яшчэ дарогай. Напэўна, яны былі з мясцовасці не вельмі далёкай адсюль і горкая практыка яшчэ не навучыла іх туляцца ляснымі і глухімі сцежкамі. Але яны былі маўклівыя. Некалькі гадзін таму назад яны былі выгнаны нямецкімі авіябомбамі ў свет. За сваімі плячыма яны пакінулі цяжар сваіх дамоў. У іх маўклівасці было адзінае для ўсіх пачуццё — вялікае і наймацнейшае за ўсё, што асталося цяпер у іх жыцці. **Гэта была нянавісць, ёй не было канца і меры, яна была большая за іх смутак** (падкрэслена мною. — В.Л.). Найбольш гэта былі жанчыны. Былі маладыя, былі сярэдніх год, былі і старыя. **Кожны з іх перажываў сваю асабістую крывавую драму... І усё асабістае злілося у кожнага у адно з усімі** (падкрэслена мною. — **В.Л.**). Мера дайшла да краёў" (Чорны К. Збор твораў у 8-мі тамах. Т.6. С. 356). Вось гэтая "мера", што "дайшла да краёў", калі агульнае "вырастае" з асабістага, становіцца матэрыяльнай сілай і штурхае народ не толькі на самаабарону, але і на барацьбу, — гэта і ёсць тое, што Л.Талстой называў "стыхійным патрыятызмам". Але гэта "стыхійны патрыятызм" па-чорнаўску, па-беларуску, значыць. Менавіта такой сілай кіраваліся ў сваёй барацьбе і быкаўскія героі Сцепаніда і Пятрок Багацькі. Гэта яны, простыя людзі, сталі галоўнымі ахвярамі вайны, яны ж і ўзялі на сябе галоўную адказнасць — за ўвесь зняважаны свет. І віну таксама — маральную, як "складаную ўзаемасувязь чалавека і свету" (І. Афанасьеў). Але гэта таксама і "віна" мастака, яго, як пісаў І.Дзядкоў, "добраахвотна

прынятая на сябе пакута, якая ўзыходзіць да памяці пра бацькоўскую сялянскую хату". Гэтак жа пакутаваў раней і М.Гарэцкі, а перадусім і Л.Талстой. На ўсіх іх быў ускладзены "дар зверху, дар Божай міласці".

Матыў пакутніцтва — гэта адзнака літаратуры ўжо XX стагоддзя. Гэты матыў займае значнае месца ў змястоўнай структуры твораў М.Гарэцкага, К.Чорнага, В.Быкава ("Знак бяды", "Аблава") і іншых. Пакутніцтва не за ідэю, не за веру, а праз ідэю, праз веру.

Парадокс вайны 1941—1945 гадоў у тым — і аб гэтым магла сказаць толькі пазнейшая літаратура, — што народ не прымаў немцаў, бо тыя неслі здзек і прыніжэнне ўласна для кожнага. Адсюль усведамленне неабходнасці барацьбы з імі. Толькі ж, змагаючыся з немцамі як з носьбітамі зла за сваю будучыню, за свой працяг на зямлі, народ разам з тым змагаўся і за сваё мінулае, якое было перажыта з такімі болем і крыўдай. Змагаўся за ўладу, якая ніколі яго не шкадавала. Баец Мачыхін з рамана В.Кандрацьева "Скупіць крывёю" адзначыць: "Не шкадуе народ наша ўлада і ніколі не шкадавала. Яна палову Расіі панішчыць, каб сябе захаваць" (Кондратьев В. Искупить кровью.// Знамя. 1991, № 12. С.77). "У вайну ўсе некага забівалі, — зазначыў В.Акудовіч. — Забівалі немцы, забівалі саветы, забівалі калабаранты, забівалі партызаны. Якое з забойстваў лічыць маральным, а якое амаральным?" А.Адамовіч бачыў асаблівы трагізм сітуацыі ў тым, што, "плацячы вялізную цану за перамогу над Гітлерам, народ набліжаў і поўную перамогу, абсалютную перамогу сталінскай тыраніі. Як да самазабыцця ілгалі мы, партызаны, сабе і няшчасным бабам, калгасьнікам, якіх фашысты палілі, забівалі за дапамогу нам, "сталінскім бандытам": затое калгасаў не будзе ўжо! І усё будзе не так, як да вайны!" (Адамовіч А. Апакаліпсіс па графіку. Мн., 1992. С. 63). Герой "Сцяганосцаў" рамантык Чарныш таксама верыў, што пасля вайны "ні нашы, ні іхнія (немцаў. — **В.Л.**), ні чые-небудзь дзеці ўжо не будуць корпацца на пажарышчах... Людзі не будуць гнуць спіну, як той сёння са скрыпкай... Пасля гэтай вайны ўсе людзі павінны стаць нарэшце... людзьмі". Ва ўсім гэтым заключаўся найглыбокі трагізм простага чалавека, асабліва вяскоўца, якога дзяржава праз прымусовую калектывізацыю ставіла проста ў невыносныя ўмовы жыцця. І выбару ніякага. Як сведчыць герой В.Быкава Ягор Азевіч ("Сцюжа"), "усё было загадзя наканавана. Першы заход няўдалы. Трэба пачынаць другі. Пакуль не скончацца сілы. Ці не прыйдзе пагібель. Бо такі, відаць, яго лёс. Ягоны лёс. Ды і народа таксама. Што ж яшчэ

застаецца? Да скону біцца за савецкую ўладу. Іншай няма". В.Кандрацьеў крыху перастаўляе акцэнты, яго герой уладу "не любіць, таму што нічога добрага яна яму не зрабіла, і зараз не шкадуе людзей, ваюе бязлітасна, да таго ж яшчэ і груба, няўмела, а вось жа не выйдзеш са строю, не пакіруешся да фрыцаў... Няможна рускаму чалавеку ратавацца самому, пакідаючы таварышаў..."

Былы "цвёрдакаменны" функцыянер Азевіч, прайшоўшы праз духоўны крызіс таталітарнай сістэмы, а пасля праз напружаныя унутраныя пошукі, вяртаецца да людзей. Камуніст Азевіч глыбока ўсвядоміў той духоўны і эканамічны тупік, у які завяла савецкая ўлада вясковае, ды і не толькі вясковае жыццё. З цягам часу былы камсамольскі важак зразумеў, што людзі для савецкай улады былі толькі сродкам для ажыццяўлення розных планаў, часта бязглуздых. Яны былі толькі матэрыялам, з якога ляпілі розныя фігуры. Гэта рабілася дзеля ідэі пабудовы сацыялізму. Але ці патрэбна была такая рэвалюцыя, а пасля калектывізацыя, для простага, працоўнага селяніна? Ці не задаволіўся б ён спрадвечным — зямлёй і воляй? Усё тое, чым займаўся актывіст Азевіч, пазней выкліча ў яго "адны расчараванні і боль". За мінулае, за савецкую ўладу Азевіч не хацеў паміраць, але "тады за што ж?" Вось пытанне, на якое герой у час вайны не мог знайсці адказу, але разам з тым цвёрда ведаў, што змагацца будзе, павінен змагацца — за тое жыццё зруйнаванае, духоўна знявечанае, за спакутаваную сваю бацькаўшчыну, да якой ён быў нябачна прыкуты духоўнымі каранямі, сваім такім жа пакручастым і не менш трагічным, як і ў яе, лёсам.

А.Хамякоў пісаў пра "незлічоныя бязважкія сілы, якія прыводзяць у дзеянне вялікія народныя масы". У звычайным сучасным жыцці яны нябачныя, а таму гісторыкі, каб неяк патлумачыць складанае мінулае, звярталіся па дапамогу да "сляпой выпадковасці"(нямецкія ідэалісты) або да "боскага ўмяшання" (рэлігійныя пісьменнікі). На думку А.Хамякова, "ва ўсіх гэтых вытлумачэннях амаль заўсёды выражаецца не што іншае, як усведамленне разумовай бездапаможнасці. Бо, калі, з аднаго боку, нельга па справядлівасці не прызнаваць шляхоў Боскай волі ва ўсёй хадзе гісторыі, то з другога — неразумна і нават амаль ці мэтазгодна з хрысціянскай пакорлівасцю брацца на сябе ўгадванне імгненняў непасрэднага ўздзеяння волі Божай на справы чалавечыя (Хомяков А.С. Соч. в 2-х томах. Т.2. М., 1994. С. 34-35). Л.Талстой лічыў, што менавіта гісторыя інтэгруе асобныя лёсы людзей, волю асобных людзей. Але не

усіх, а толькі тых, хто наблізіўся да разумення Боскай волі, адмовіўшыся ад сваіх асабістых абстракцый і цалкам аддаўшыся інтуітыўнаму пранікненню ў таямнічую хаду гісторыі. М.Бярдзяеў пайшоў яшчэ далей: "Лёс чалавека, які ляжыць у аснове гісторыі, дапускае звышгістарычную мэту, звышгістарычны працэс, звышгістарычнае вырашэнне лёсу гісторыі ў іншым, вечным часе".

Беларуская літаратура вырашала паняцце лёсу чалавека, абстрагуючы яго ад паняцця Боскай волі. Паняцце лёсу чалавека як асновы гісторыі мае выразную нацыянальную афарбаванасць. Той жа Азевіч з аповесці В.Быкава "Сцюжа" здзіўляецца, чаму народ такі незласлівы да сваіх крыўдзіцеляў, "што гэта — сялянскае, жаночае? Ці нацыянальнае? Адкуль яно ўзялося, дабро ці не?" Вайна навязвала народу свае законы, законы барацьбы. У гэтым была, калі можна так сказаць, сіла маральнай неабходнасці для беларусаў. Гэтай сіле павінен быў падпарадкавацца кожны чалавек, нават самы незласлівы, талерантны. Як Нявада ("Пошукі будучыні" К. Чорнага) ці Пятрок Багацька ("Знак бяды" В.Быкава). Абодва пачыналі з пазіцыі несупрацíўлення, са спадзявання, што вайна абыдзе іх бокам, што немцы чапаць іх не будуць. "Жалезнага звера голымі пальцамі не задушыш, — цвяроза мяркуе стары Нявада. — А трэба перахавацца і перачакаць, пакуль звера даб'юць. На гэта ёсць войска. Армія ж недзе павінна даць яму ў косці". Яшчэ больш памяркоўна ставіцца да немцаў Пятрок: "Мы перад імі не вінаватыя. А калі з імі па-добраму, дык, можа, і яны... Не з'ядуць, можа..." Гэтыя простыя сяляне не хацелі ваяваць ні з немцамі, ні з паліцаямі. Пятрок нават угодліва падладжваўся то пад характар немцаў, то пад здзеклівыя патрабаванні паліцаяў. Яго паводзіны найбольш дакладна перадаюць тыповае нацыянальна-сялянскае: "Каб засцерагчыся ад бяды, трэба паводзіць сябе як мага абачлівей і цішэй. Гэта як з куслівым сабакам..." Толькі "жалезны звер" у абліччы фашызму быў "нетыповы" па сваёй злачыннай сутнасці. Гэта быў новы гістарычны монстр. Неўзабаве Пятрок, гэты "цёмны мужык", які "толькі цьмяна мог меркаваць аб усім сваім небагатым мужыцкім розумам", усвядоміў, што "калі так пойдзе і далей, дык на жыццё разлічваць залішне, прыйдзецца сканаць, і, можа, чым хутчэй, тым лепей". Аўтар уважліва сочыць за унутраным станам свайго героя. Ён у працэсе, у самым зараджэнні "схоплівае" парасткі супраціўлення, узнікненне ўнутранай сілы супрацьстаяння, якая ёсць адбітак супрацьстаяння нацыянальнага. Гэта і ёсць працэс "станаўлення" лёсу беларуса.

І.Стаднюк пісаў, што сілу салдат "памнажалі прыродная ў расіян нянавісць да рабаўнікоў і — тужлівая мужнасць — уменне пакутаваць і гатоўнасць ісці на самаахвярнасць у імя Айчыны". У беларуса Нявады не было народжанай нянавісці, ён быў народжаны любіць — дом, сям'ю, бацькаўшчыну. Сваю нянавісць беларусы **выпакутавалі** — усе разам і кожны паасобку — дзеля уласнай годнасці, дзеля ратавання свайго "дома", які ў кантэксце прозы К.Чорнага і В.Быкава чытаецца як "дом" нацыянальны. Лізавета Ракуцька ("Пошукі будучыні") спасцігае простую ісціну, што "не можна так жыць, абы жыць. Трэба шукаць таго, каго трэба з замілаванасцю ведаць і каго трэба ненавідзець".

Як сказаў яшчэ Бялінскі, калі ёсць ідэі часу, дык ёсць і формы часу. Ёсць і вобразы часу, дадамо. Гэта даказана вопытам Гётэ, А.Пушкіна, Л.Талстога, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа. Гэта даказана і хадою найновай літаратуры.

Найбольш выразная рыса класічнага рэалізму — залежнасць індывідуальнай свядомасці ад таго асяроддзя, што яго нарадзіла і сфармавала. Л.Талстой, увогуле пагаджаючыся з гэтым, усё ж лічыў, што найперш "чалавек ёсць стварэнне ўсемагутнага, уседобрага, усёведнага бога"(7,332). Пісьменнік сцвярджаў боскі пачатак, духоўную дэтэрмінаванасць "я" чалавека. У прынцыпе ж, мера абумоўленасці паводзін, псіхалагічнага складу, жыццёвых мэтаў асобы можа прыкметна адрозніваццa, колькасць матывіровак узрастаць, зона "мадэльнасці" скарачацца, індывідуальны астатак павялічвацца, але сам прынцып дэтэрмінізму застаецца непарушным.

На гэтай аснове выраслі тыповыя характары Мікалая Растова, П'ера Бязухава, Андрэя Балконскага, Наташы Растовай, Платона Каратаева, якія не толькі прадстаўлялі сваю эпоху, але і сілаю таленту Л.Талстога пераўзышлі яе, перайшлі ў XX стагоддзе, "прараслі" ў вобразах Лявона Задумы, Волечкі Нявадавай, Антона Цвіркі, Васіля Дзятліка, Ганны Чарнушкі, Сцепаніды і Петрака Багацькаў. Гэта вобразы-архетыпы, кожны з якіх адкрывае адначасова індывідуальна непаўторны і нацыянальны свет.

Створаны Л.Талстым тып героя рэфлексуючага знайшоў сваё адлюстраванне ў М.Гарэцкага, які разам з Я.Коласам даў свету тып беларускага інтэлігента. Герой М.Гарэцкага спрабуе асэнсаваць праблему нацыянальнага жыцця і нацыянальнай культуры: "...Мы гадуемся на чужым грунце і забываемся добра разумець свой уласны [...] Бо што ж? — Тое лепшае, чалавецка-беларускае, што ўзгадавала ўва мне сям'я (і то не ўся наша сям'я), доўгі час выкарыс-

тоўвала ўва мне... школа. Ну ці ж навучыла мяне школа любіць свае, беларускае, даражыць хараством роднае прыроды, праняцца гармоніяй розных з'яў? Чаму нас вучылі? Во і віси паміж небам і зямлёй. Ці рві з душы роднае карэнне і адракайся роднай хаты, ці ўцякай ад панскай вопраткі і цягайся за прымітыўнаю дзяржаўнаю сахою" (Гарэцкі М. Збор твораў у 4-х тамах. Т.2. Мн., 1984. С.39—40.). Герой М.Гарэцкага хоча быць беларусам і чалавекам адразу, а не так, што калі ты беларус, дык ужо і недачалавек, чалавек ніжэйшы за іншых. Як адзначыла Л.Корань, "М.Гарэцкі б'ецца-спасцігае нацыянальны характар як мысляр-аналітык, крытык, але і як заступнік-будзіцель духу, як творца і прарок". Як біўся-спасцігаў рускі нацыянальны характар Л.Талстой. Як пазней вызначалі роднае месца беларусаў сярод іншых еўрапейскіх народаў К.Чорны, І.Мележ, В.Быкаў, У.Караткевіч.

Князь Балконскі перад смерцю, прайшоўшы праз унутраны крызіс і вялікія духоўныя выпрабаванні, знаходзіць, нарэшце, сэнс жыцця, духоўную гармонію. Ён зразумеў смерць як вызваленне ад жыцця зямнога. Усё тое, што мае значэнне і чым даражаць пры жыцці, там — "не патрэбна" (7,66). Князь Андрэй вызваліўся ад ціску жыцця, і ў яго душы "распусцілася кветка любові, спрадвечнай, свабоднай, якая не залежала ад гэтага жыцця..." (7,65). І гэтае адчуванне тым больш паглыблялася, чым больш ён аддаляўся ад зямнога жыцця. Князь зразумеў, што "памерці — азначае мне, часціне любові, вярнуцца да агульнага і спрадвечнага вытоку" (7,69).

Л.Талстой успрымаў пакуты як дабро, як шчасце. "Палова жыцця кожнага чалавека праходзіць у пакутах, якія ён не толькі не прызнае пакутлівымі і не заўважае, але лічыць сваім шчасцем..."(17,126). "Для чалавека, які жыве па свайму закону, няма смерці і няма пакут"(17,130). Праз стагоддзе, ужо ў постсавецкія часы, другі рускі пісьменнік Б.Васільеў, закранаючы тэму пакут, падтрымае Л.Талстога: "Жыць, — скажа аўтар рамана "Дом, які пабудаваў дзед", — азначае пакутаваць, абміраючы ад шчасця, ці камянеючы ад гора, плачучы ад асалоды ці плачучы ад гневу, задыхаючыся ад пяшчоты ці бялеючы ад болю, за сябе ці за іншых, але пакутаваць, бо жыццё, у якім няма пакут, ператвараецца ў спосаб існавання бялковых цел".

Л.Талстой кіраваўся ў сваіх маральных і філасофскіх пошуках хрысціянскім разуменнем жыцця і смерці і трактаваў жыццё чалавека як імкненне да шчасця праз набліжэнне да Бога. Класічная гуманістычная свядомасць бачыла трагедыю жыцця ў трагедыі смерці. Ваенная проза М.Гарэцкага стаіць на пазіцыях менавіта

класічнай гуманістычнай свядомасці. Талстоўскі ідэал жыцця ўвасабляўся ў ідэі паяднання з усімі. Герой М.Гарэцкага ішоў па шляху раз'яднання з усімі. У гэтым яго найбольшая трагедыя. Лявон Задума глядзіць, як ездавы, якому снарадам распарола жывот, запіхвае "сінія, брудныя кішкі назад пад гімнасцёрку". Уражаны незвычайным відовішчам, герой і верыць і не верыць, "што пад гэтымі парванымі кішкамі ёсць нешта, што называецца богам". Расчараваўшыся ў жыцці, у Богу, які стварыў такое жыццё, ён хоча зразумець смерць. Ён назірае за сцэнай, як "батарэец Талстой, слаўны хлопец, узяў аднаго забітага немца за руку, патрымаў яе, адубелую, і ціхенька палажыў. Нашто ён гэта зрабіў? Мусіць, цікавіўся, што такое мёртвы". Але цікавіўся для каго? Для сябе, для астатняга чалавецтва? Ці каб глыбей спасцігнуць сэнс жыцця? Ці, можа, смерці? Адказ шматзначны: і для сябе, і для чалавецтва, і для спасціжэння сэнсу жыцця і смерці. Але найперш смерці. Такі аналіз патрэбен і аўтару і яго герою, каб зразумець для сябе нешта галоўнае. Ужо ў наступным баі бамбардзір-наводчык Талстой сам ляжаў "з жоўтымі зубамі, скалячы іх ад мукі". Дык ці для гэтага ён нараджаўся і жыў? Салдат паміраў, як і нараджаўся, у адзіноце. Ён хацеў, прагнуў гэтай перадсмяротнай адзіноты, як канаючы ў канаве сабака. Паралель з сабакам вельмі сімвалічная. Гэта трагічны вынік чалавека на вайне. Але гэта і матыў адзіноты чалавека ў свеце наогул. У свеце, які духоўна дэградаваў. Высокія мары, якія акрылялі героя М.Гарэцкага ў юнацтве, жорстка разбураны. І галоўнае — назаўжды. Дык у чым жа сэнс чалавечага жыцця? У смерці ці нараджэнні? Або вінавата жыццё, што чалавек, народжаны як істота найвышэйшая, індывідуальна-непаўторная і высока духоўная,ператвараецца ў нікому непатрэбную пясчынку, у "пушачнае мяса" (Э.Рэмарк).

Менавіта соцыум, пазбавіўшы чалавека самарэалізацыі, зрабіў героя М.Гарэцкага песімістам, ізгоем у роднай вёсцы. Дык ці жыццё гэта наогул? "І што яно гэта? І што ж гэта такое? Жыў чалавек і памірае, проста ўсё. І няма нічога вышэйшага...І вечная загадка".

Крытык І.Чыгрын, звяртаючыся да аповесці "На імперыялістычнай вайне", падкрэсліваў: "Уся неардынарнасць Задумы якраз у тым і заключаецца, што, асуджаючы вайну як з'яву бесчалавечную, не прымаючы яе, герой М.Гарэцкага з цягам часу ўсё больш і больш зацягваецца ёю ў гібельныя нетры, урастае ў асяроддзе, становіцца яго арганічнай часткай... Адбываецца размыванне, нівеліроўка асобы. Словам, адбываецца непажаданае. Душа падвяргаецца

эрозіі" (Чыгрын І.П. Паміж былым і будучым. Мн., 1994. С.67). У гэтай духоўнай "эрозіі" заключаецца найбольшая трагічная супярэчнасць вайны. І не толькі першай сусветнай, але і 1941—1945 гадоў. І.Афанасьеў бачыў алагізм вайны ў неабходнасці "выратоўваць правы на жыццё — за кошт самога жыцця. Зрабіць справядлівае шляхам такой ахвяры, якая сама ўжо ёсць несправядлівасць з пункту гледжання безумоўнай самакаштоўнасці чалавечага жыцця як выключнага набытку ў лёсе кожнага". Праўда, тут жа крытык і дадае: "Ісціна — немагчыма без страт".

Герой вайны ў беларускай літаратуры адметны ў сваім нацыянальным самавыяўленні. Ён амаль (за вельмі рэдкім выключэннем) пазбаўлены пафаснасці, "гучнасці", ён будзённы і зямны.

Вобраз Глечыка ("Жураўліны крык" В.Быкава) — тыповы для нацыянальнай прозы 60-х гадоў. З аднаго боку, у адпаведнасці са схемай тыпалагічнай агульнасці, пісьменнік працягвае традыцыі рамантызацыі характару чалавека (вобраз Фабрыцыо ў Стэндаля, Мікалай Растоў у Л.Талстога). З другога — абвострана рэалістычныя традыцыі М.Гарэцкага (Лявон Задума і асабліва Хомка Шпак — "Ціхая плынь"). Гэтых герояў паядноўвае агульная жыццёвая сітуацыя, трагічная сітуацыя. Толькі герой В.Быкава не рамантызуе вайну як Фабрыцыо ці Мікалай Растоў, але і не драматызуе яе ў такой ступені як Задума і Хомка. Ён успрымае вайну як страшную неабходнасць. І нават перад смерцю не страчвае веру ў жыццё. А галоўнае — і гэта чыста нацыянальнае — Глечык у апошнія хвіліны жыцця думае пра маці, вініцца перад ёю.

Для беларуса Лявона Задумы ў рускай арміі здрада з'яўляецца дзеяй натуральнай, ён не хоча змагацца і гінуць за чужыя інтарэсы, хоць і даваў прысягу на вернасць цару. Здрада — гэта нават пэўнае маральнае выйсце для героя М.Гарэцкага. Зусім інакш глядзіць на свае абавязкі 18-гадовы салдат Глечык, хоць і для яго здрада, гэта найперш катэгорыя маральнага плана. Існавалі перашкоды, якія малады і нявопытны баец пераступіць не мог: "...загад камбата, які належала выканаць, гнеў таварышаў, каторы ў такіх умовах нельга было стрываць, вечная ганьба трусасці, што разадрала б яго душу, урэшце — такія далёкія, але ўладарныя паняцці, як прысяга і абавязак перад Радзімай". Вось у гэтым увесь Глечык. Але разам з тым ён не спрошчаны герой, а натура глыбока індывідуальная. Ён жывы і рэальны, як былі рэальныя для свайго часу Мікалай Растоў і Лявон Задума. Як былі рэальныя для

украінскай літаратуры рамантык Чарныш і "філосаф" Духновіч ("Чалавек і зброя" А.Ганчара). Апошнія ў савецкай літаратуры пазначаны ў большай ступені рысамі нарматывізму.

Чалавеку кожны раз нанова даводзіцца рабіць свой выбар і вырашаць для сябе галоўныя пытанні жыцця і свайго месца ў ім. Мадэрнісцкая літаратура, у тым ліку і экзістэнцыяльная і часткова літаратура "згубленага пакалення", стварала свой "сусвет" няўпэўненасці, хаосу і "Нудоты", сусвет, у якім "Чужы" па сваёй сутнасці быў ворагам людзей, быў адчужаны ад іх, сусвет, які праецыраваўся на сваім унутраным "я". Л.Талстой, ведаючы аб гэтым сусвеце чалавечага адчаю і пакут, прайшоўшы праз уласны духоўны крызіс, выйшаў да чытача з канцэпцыяй жыцця не дзеля сябе (да чаго пазней будуць заклікаць героі-экзістэнцыялісты), а з верай, што свабода даецца чалавеку для таго, каб адчуць і ўсвядоміць у сабе чалавечы пачатак, знайсці ў сабе чалавека як "сына Бога", быць "зброяй волі Божай" (Толстой Л. Полн. собр. соч. Т.39. С.14). Л.Талстой марыў стварыць духоўную еднасць людзей на аснове ўзаемнай любові і спагадлівасці. Для літаратуры XX стагоддзя гэта мара была ужо недасягальнай. М.Бярдзяеў, абапіраючыся на старажытныя міфы, даводзіў нават, што "пачатак свабоды зла быў пакладзены ў аснову сусветнага гістарычнага працэсу". Аўтар "Вайны і міру" адлюстраваў стан нацыянальнай свядомасці, самай важнай асаблівасцю якой была, як слушна заўважыў А.Нікалюкін, "сусветная спагадлівасць". Гэтая спагадлівасць не дазваляла рускаму народу замкнуцца ў межах сваёй карпаратыўнасці. Ф.Дастаеўскі таксама пісаў "аб братэрстве людзей і аб тым, што да сусветнага, да ўсечалавецка-братэрскага яднання сэрца рускае, можа быць, з усіх народаў найбольш прадвызначанае" (Достоевский Ф.М. Полн. собр. соч. Т. 12. С.148).

У аснову філасофіі гісторыі Л.Талстога пакладзена "руская ідэя" аб месіянскай ролі рускага народа, яго богаабранасці. Ідэя гэтая адухаўляла і мацавала рускі народ, хоць па прычыне сваёй ілюзорнасці і адрывала яго ад гістарычнай рэальнасці, рамантызавала яго паводзіны на вайне. Адсюль і рамантызацыя некаторых вобразаў і пэўным чынам мастацкага вобраза радзімы.

Філасофія гісторыі ў беларускай літаратуры будавалася на іншых прынцыпах. Яна менш за ўсё абапіралася на філасофскія і рэлігійныя абстракцыі, не выходзіла за межы зразумелага народу светаўспрымання. Яна размаўляла з народам не ідэямі і разумовымі канцэпцыямі, а вобразамі, вобразамі-сімваламі і вобразамі-тыпамі, якія

паступова уздымаліся да узроўню нацыянальных вобразаў свету. У гэтых вобразах праз канкрэтна-індывідуальнае, праз роднасць са сваім этнасам і стылем яго мыслення "закладзены" рысы народнага светаадчування. Воля да жыцця напаўняе героя, простага вяскоўца, спрадвечнага працаўніка на зямлі асаблівай энергіяй, унутранай сілай. У адрозненне ад герояў Л.Талстога з іх нястрымным жаданнем спасцігнуць сэнс жыцця і смерці, герой К.Чорнага імкнецца проста адстаяць, адваяваць сабе права на жыццё прыстойнае — жыццё сваім домам, сваёй сям'ёй, каб побач расла шыпшына або нават, каб узвышаўся крыж, яго, селяніна, Галгофа. Ён і там жыць згодны, толькі каб свабодна, без чужынцаў і без паганятага. Нацыянальная ідэя як аснова вобразаў-тыпаў у беларускай літаратуры звязваецца найперш з раскрыццём духоўнага патэнцыялу беларускага народа, багаццем яго нацыянальнага "я", якое цесна судакранаецца з духоўнымі каштоўнасцямі агульначалавечага, сусветнага значэння.

Беларуская літаратура аб першай і другой сусветных войнах будавалася на нацыянальных гуманістычных традыцыях, але пераймала пры гэтым і традыцыі сусветнай літаратуры, а перадусім традыцыі Л.Талстога. Дзякуючы гэтаму яна ўпісваецца на роўных у кантэкст літаратуры сусветнай. Падабенства і кантрасты ў спосабах выражэння нацыянальнай эстэтычнай свядомасці — натуральная асаблівасць гэтага складанага працэсу.